Кнігі–гэта дзверы, што выводзяць цябе з чатырох сцен.
Яны вучаць цябе, выхоўваюць, з імі ты падарожнічаеш,
марыш, уяўляеш, пражываеш іншыя жыцці,
а сваю памнажаеш у тысячу разоў.

*А. Перас-Рэвертэ*

Бібліятэка
Палескага дзяржаўнага універсітэта

# Літаратурны гід

## Кнігі ад класікі да сучаснасці

# Чытайце **лепшае** з намі



**Паважаныя карыстальнікі бібліятэкі!**
Многія з нас любяць правесці вольны час з цікавай кнігай. Але як выбраць з мора выдадзенай літаратуры той твор, што прыйдзецца вам па душы? Для тых, хто любіць пачытаць добрыя кнігі або, нарэшце, хоча далучыцца да гэтага займальнага занятку, мы рэалізуем праект **«Чытайце лепшае з намі: кнігі ад класікі да сучаснасці»**, у рамках якога штомесяц будзем знаёміць вас з лепшымі кнігамі рознай тэматыкі з фонда нашай бібліятэкі.

# 21 лютага – Міжнародны дзень роднай мовы

*Гэты дзень асаблівы для кожнай нацыі, кожнага народа, бо няма народа без мовы, няма мовы без яго носьбіта. І беларусы не выключэнне. Нам у спадчыну засталася ўнікальная мова – жывая і мілагучная, песенная і паэтычная, старажытная і сучасная.*

## 5 кніг па роднай мове

Беларуская мова адносіцца да ўсходнеславянскай падгрупы індаеўрапейскай моўнай сям'і. Яна лічыцца самай мілагучнай пасля італьянскай. Гісторыкі сцвярджаюць, што беларуская мова яшчэ і самая старажытная сярод славянскіх моў. Яна утрымлівае велізарную колькасць слоў, якія нельга перавесці даслоўна. У гэтым ёсць яе ўнікальнасць і непаўторнасць.

*Мова робіць нас сапраўднымі беларусамі, таму любіце, шануйце і ведайце нашу родную беларускую мову, размаўляйце на ёй часцей!*















**Беларуская мова і мовазнаўства:** XIX стагоддзе: манаграфія / І. А. Гапоненка [і інш.] ; рэд. М. Р. Прыгодзіч ; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. - Мінск : БДУ, 2013. - 147 с.

У манаграфіі аналізуюцца асаблівасці станаўлення і развіцця беларускай літаратурнай мовы ў XIX ст. у галіне лексікі, графікі і арфаграфіі, анамастыкі, даследуецца лінгвістычная спадчына П. Шпілеўскага і І.Насовіча.




*“Толькі праз родную мову чалавек можа стаць беларусам, бо ў ёй хімія і фізіка, гісторыя і батаніка, эканоміка і культура таго, што называецца нацыяй, народам”.*

Янка Сіпакоў

**Багамолава, А. М. Стылістыка і культура беларускага маўлення:** дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка / А. М. Багамолава, Г. К. Семянькова. - Мінск : Издательство Гревцова, 2012. - 304 с.

*У вучэбным дапаможніку даецца падрабязная характарыстыка функцыянальных стыляў сучаснай беларускай мовы: апісваюцца падстылі, жанры, лексічныя, марфалагічныя, сінтаксічныя асаблівасці; разглядаюцца камунікатыўныя якасці маўлення (правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціня, дарэчнасць, багацце, выразнасць, вобразнасць, сціcласць) і сродкі іх рэалізацыі. У практычнай частцы прапануюцца разнастайныя па змесце і мэце практыкаванні, накіраваныя на авалоданне і замацаванне тэарэтычнага матэрыялу курса, на ўдасканаленне ўменняў выкарыстоўваць атрыманыя веды пры аналізе моўных з'яў і фактаў.*



**Дынаміка літаратурнай нормы сучаснай беларускай мовы** / Н. П. Еўсіевіч [і інш.] ; Нацыянальная Акадэмія Навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, Філіял "Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і янкі Купалы". - Мінск : Беларуская навука, 2015. - 440 с.

Манаграфія прысвечана аналізу змен і заканамернасцей пісьмовай беларускай мовы на рубяжы XX–XXI стагоддзяў. У даследаванні абагульнены асаблівасці сучаснага слоўнікавага складу, прадстаўлены новы лексічны матэрыял, які актыўна выкарыстоўваецца ў СМІ. Прадстаўлена сістэмнае суаднясенне кадыфікаваных словазмяняльных, словаўтваральных, сінтаксічных норм і моўнай практыкі.



**Сіўковіч, В. М. Беларуская мова: арфаграфія, пунктуацыя:** кароткі даведнік / В. М. Сіўковіч. - Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2021. - 176 с.

*Даведнік адметны тым, што ў зручным для карыстання фармаце змяшчае сістэматызаваны выклад арфаграфічных і пунктуацыйных нормаў сучаснай беларускай мовы. Структура даведніка дазваляе хутка знайсці і надзейна замацаваць у памяці неабходную інфармацыю.*




*Нашу беларускую мову не раз спрабавалі знішчыць, але ж данеслі яе да нас продкі. Няма ніводнага вобраза, з'явы, пачуцця, якіх не змагла б перадаць нам наша мова. Яна самая звонкая, пявучая, жывая, непаўторная, ласкавая і самая дарагая для кожнага беларуса...*

Максім Танк

**Шклярык, В. А. Мікратапанімія Усходняга Палесся у кантэксце развіцця рэгіянальнай лексічнай сістэмы:** манаграфія / В. А. Шклярык ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, Інстытут мовазнаўства ім. Якуба Коласа. - 2-е выд. - Мінск : Беларуская навука, 2019. - 196 с.

*У манаграфіі на шырокім фактычным матэрыяле (больш за 30 тысяч найменняў), частка якога яшчэ не была ў навуковым звароце, разглядаюцца лексіка-семантычныя асаблівасці мікратапонімаў з усёй прасторы Усходняга Палесся. Робіцца спроба вызначыць месца і ролю назваў дробных геаграфічных аб'ектаў пры вырашэнні пытання аб дыялектным чляненні рэгіёна, выяўленні і ўдакладненні семантыкі мясцовых апелятываў і тэрыторыі іх распаўсюджання ў межах усходнепалескага краю.*





# З прадстаўленымі кнігамі вы можаце азнаёміцца ў чытальнай зале бібліятэкі вучэбнага корпуса № 1

**Складальнік:**
Бібліятэкар 1 катэгорыі Рыбчынская А.А.,
Бібліятэка Палескага дзяржаўнага універсітэта